[5] Heick O. W. A History of Christian Thought. Philadelfia, 1965. V. 1. P. 200; Столяров А. А. Проблема свободы у Аврелия Августина // Античная философия в интерпретации буржуазных философов. М., 1981. С. 66.

І. А. ЛІСАВЫ, К. А. РАВЯКА

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ЭПОХІ ЭЛІНІЗМУ Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ (1945—1975)

Цяперашні стан навукі аб антычнасці ў Польшчы даследаваны часткова савецкімі і польскімі вучонымі. Што датычыцца пытання элінізму, якое займае адно з важнейшых месц у польскай гістарыяграфіі антычнасці, то нашы веды аб ім абмяжоўваюцца толькі асобнымі рэцэнзіямі пераважна на старонках часопіса «Вестник древней истории», а таксама зарысоўкамі ў працах савецкіх гісторыкаў І. С. Свянціцкай, К. К. Зельіна, А. І. Паўлоўскай і некаторых іншых.

Адным з першых, хто пачаў вывучэнне элінізму ў пасляваеннай Польшчы, быў прафесар Р. Таўбеншлаг, аўтар вядомай манаграфіі аб прававых адносінах у грэка-рымскім Егіпце ў святле даных папірусаў [1]. Будучы прадстаўніком старой школы, ён выступіў у гэтай працы з пазіцый марксісцкай ідэалогіі. Асноўную ўвагу вучоны ўдзяліў даследаванню на шырокім сацыяльна-палітычным фоне канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права, а таксама спецыфікі ўлады ў грэка-рымскім Егіпце. Даследуючы асаблівасці кантролю дзяржавы над эканомікай, Р. Таўбеншлаг выкрывае незвычайную рэгламентацыю ўсіх бакоў эканамічнай дзейнасці Егіпта: у галіне сельскай гаспадаркі дзяржава дасканала рэгулявала парадак здачы зямлі ў арэнду; не менш дасканала рэгламентаваўся парадак пасадкі і высячкі леса, рыбнай лоўлі, здабычы солі і да т. п.

Заслугоўваюць увагі адносіны аўтара да рабства, у прыватнасці яго даследаванні аб крыніцах апошняга: самапродажы, продажы дзяцей у рабства, аб даўгавым нявольніцтве. Галоўнай крыніцай рабства ў элiністычным Егіпце Р. Таўбеншлаг лічыць ваеннапалонных, якія абвяшчаліся царскімі рабамі, і пасля продажу з аўкцыёна станавіліся ўласнасцю прыватных асоб.

Аднак, як слушна заўважыў К. К. Зельін [2], Р. Таўбеншлаг разглядае матэрыял аб рабаўладальніцтве выключна з юрыдычнага пункту гледжання, гэта значыць дае хутчэй характарыстыку пэўных юрыдычных інстытутаў, паказвае сістэму адносін, а не іх развіццё. Адсюль і недахопы даследавання.

Крыніцы паступлення рабоў у элiністычны перыяд, праца і жыццё нявольнікаў і іх здольнасці да самастойных дзеянняў у святле законадаўства і жыццёвага вопыту — гэтыя пытанні дасканала даследаваны гісторыкам І. Бежуньскай-Малавіст.

Якасна новым этапам у развіцці польскай гістарыяграфіі антычнасці сталі 50—60-я гады, калі была створана Польская Акадэмія навук, у склад якой увайшлі Інстытут гісторыі, а таксама Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры, дзе даследаванню антычнасці стала ўдзяляцца павышаная ўвага.

Звыш двух дзесяцігоддзяў даследуе праблемы элінізму вучаніца Р. Таўбеншлага — цяпер прафесар папіралогіі Варшаўскага універсітэта А. Свідэрэк. Па-першае, трэба назваць яе манаграфію «У «царстве» Апалонія: Грамадства Пталамеяў у святле архіва Зянона»[3]. У кнізе аналізуюцца папірусныя дакументы з архіва Зянона, ускрываецца іх значэнне для гісторыі грэка-егіпецкага грамадства, даследуюцца ўзаемаадносіны паміж Фаюмам і іншымі раёнамі Егіпта, у прыветнасці Александрыяй, а таксама вывучаецца сацыяльны састаў насельніцтва Фаюма. А. Свідэрэк дзеліць усё свабоднае насельніцтва на тры групы: самых бедных, якімі былі, па яе меркаванні, егіпцяне; людзей з сярэднім дастаткам (дробныя чыноўнікі, клерухі [4] і часткова жрэчаства); багатых (высокапастаўленыя чыноўнікі, жрацы, цар і прыдворныя — амаль без выключэння грэкі і македонцы). На жаль, аўтар выключае з асяроддзя бяднейшае насельніцтва грэкаў і македонцаў; людзі, якія знаходзіліся ў цеснай сувязі з домам Зянона, лічацца пераважна не храмавымі рабамі, а свабоднымі [5]; гіеродулы не разглядаюцца як храмавыя рабы ў Егіпце. Усе гэтыя недахопы не памяншаюць важнасць укладу А. Свідэрэк у скарбніцу польскай гістарыяграфіі антычнасці.

Звяртаючыся да асобных прац па гісторыі элінізму, адзначым, што ўпер-

шыню ў польскай гістарыяграфіі пачаў вывучэнне пытання сацыяльна-эканамічнай структуры малаазійскіх полісаў Т. Завадзкі [6]. Вучоны разглядае элінізм як перыяд узаемапранікнення сацыяльна-эканамічных форм, што ўтварыліся ў краінах эліністычнага Усходу, і форм, створаных грэчаскім светам. У гэтым, крыху аднабаковым, выяўленні элінізму каштоўна тое, што Т. Завадзкі лічыць яго з'явай, у першую чаргу, сацыяльна-эканамічнай, атрымаўшай развіццё пры актыўным удзеле ўсходніх і грэчаскіх элементаў. Аўтар даследуе буйныя дамены як земляробчы тып, іх структуру і сістэму адміністрацыі, а таксама становішча сялян у даменах і за іх межамі.

Т. Завадзкі аспрэчвае пункт гледжання М. І. Растоўцава, які даволі перабольшаў памеры «царскай зямлі» і ўвогуле буйнага землеўладальніцтва. Польскі вучоны далучаецца да меркаванняў некаторых іншаземных гісторыкаў (Свобада, Джонсан, Бікерман), якія сцвярджалі, што сістэма буйных даменаў існавала толькі на невялікай частцы царскай зямлі. Характэрнай рысай становішча сялян аўтар лічыць тое, што яны маглі быць адчужаны толькі сумесна з дваром і разглядаліся як падданыя і ўласнасць цара: у надпісу Мнесімаха іх адрозніваюць ад рабоў. Сацыяльны і юрыдычны статус сялян быў гарантаваны ад замахаў буйных уладальнікаў спецыяльнай юрысдыкцыяй. Т. Завадзкі таксама лічыць, што спецыфіка аграрных адносін у Малой Азіі даследуемага перыяду характарызавалася перш за ўсё значнай асабістай залежнасцю сялян ад прыватных землеўладальнікаў і адсутнасцю якой-небудзь арганізацыі, у адрозненне ад асаблівай групы вольных сялян-абшчыннікаў, якія жылі ў самакіравальных сельскіх пасяленнях. Аднак аўтар не ўлічыў тую акалічнасць, што формы залежнасці сялянства мяняліся паступова, у сувязі з развіццём поліса.

Сацыяльны аспект гэтага перыяду трапна выражаны ў даследаванні Г. Купішэўскага і Ю. Маджэеўскага, які прысвечаны функцыям гіперэтаў у апараце грэка-рымскага Егіпта. Манаграфія напісана на аснове вывучэння папірусных дакументаў, у прыватнасці архіва Зянона [7]. Аднак, як адзначаюць вучоныя, тэрмін «гіперэт» неадназначны. У ім адлюстроўваюцца тры адценні: гіперэты — служачыя судовага і фінансавага апарату, гіперэты — у штаце альбо ў гаспадарцы Апалонія і гіперэты — у значэнні «дапамагаючыя», «абслугоўваючы персанал» у якой-небудзь рамеснай вытворчасці, напрыклад, ткачы. Становішча двух першых катэгорый гіперэтаў было, відаць, становішчам вольных людзей; становішча гіперэтаў-рамеснікаў нявызначана: імі маглі быць вольныя і рабы.

Формы рамеснай вытворчасці ў грэка-рымскім Егіпце вывучала Э. Віпшыцка [8]. Яна, зыходзячы з тэзіса, што адной з важнейшых рыс антычнай эканомікі з'яўляецца яе неманалітнасць, імкнецца нарысаваць мадэль егіпецкай рамеснай вытворчасці, раздзяліўшы яе на дзве групы: рамяство, якое цесна звязана з месцам вытворчасці і сыравінай, і рамяство, якое развівалася ў рамках дамашняй гаспадаркі, а таксама такі тып вытворчасці, калі рамеснік адначасова займаўся і земляробствам. Дробны тып рамесных майстэрань быў уласцівы і храмавым гаспадаркам. Аднак робячы папрок І. Ф. Фіхману, што той толькі мімаходзь закрануў даследуемае пытанне, Э. Віпшыцка па сутнасці нічога новага не ўнесла [9]. Што датычыцца рабоў, то, на думку даследчыцы, іх праца і становішча мала чым адрозніваюцца ад працы і становішча вольных рамеснікаў. Э. Віпшыцка імкнецца таксама паказаць адносіны дзяржаўнай улады Егіпта да рамеснай вытворчасці, у прыватнасці да дзяржаўных майстэрань, царскіх манаполій, а таксама выканання заказаў для арміі.

70-я гады ў развіцці польскай гістарыяграфіі антычнасці — самы плённы перыяд: праявіўся павышаны інтарэс да праблем сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі. У гэтым плане заслугоўвае ўвагі даследаванне М. Пенткоўскай аб патранаце ў пталамеяўскім Егіпце [10]. Вучоная лічыць, што тэрмін «патранат» ва ўласным сэнсе першапачаткова праяўляўся і прымяняўся як «пратэкцыя». І толькі ў II ст. да н. э., калі дораныя гаспадаркі былі канфіскаваны, патранат набраў сілу, дзякуючы аслабленню, дэцэнтралізацыі дзяржавы. Ратуючыся ад падаткаў, пад патранат пераходзілі сяляне, нярэдка вёскамі, шукалі заступніцтва храмы, кліентамі сваіх камандзіраў станавіліся салдаты. І толькі рымскія заваяванні, якія ўзмацнілі дзяржаўны апарат, пакончылі з патранатнымі адносінамі ў Егіпце. Аднак размова пра добравольны пераход пад патранат патрабуе выдзяліць яго канкрэтныя рамкі: канец II — пачатак I ст. да н. э., калі буйныя чыноўнікі атрымалі магчымасць злоўжываць сваёй уладай. Яны перавялі

патранат з чыста маральнай залежнасці ў залежнасць эканамічную і патрабавалі за гэта матэрыяльнай кампенсацыі.

Адна з важнейшых праблем гісторыі элінізму — гэта рабства. Яна ўсебакова вывучана прафесарам І. Бежуньскай-Малавіст [11]. У сваім дакладзе «Аб некаторых нетыповых формах рабства ў старажытным свеце» (1967) яна даследавала папірусныя крыніцы грэка-рымскага Егіпта, у прыватнасці завяшчанні, шлюбныя дагаворы і інш., дзе ўпамінаюцца рабы, праца каторых давала іх гаспадарам даход. Гэта, у першую чаргу, узнос аплаты саматойна працуючымі рабамі, а таксама — здадзенымі ў наймы рабынямі-карміліцамі, рамеснікамі, а часта і малалетнімі рабамі-вучнямі. І. Бежуньска-Малавіст прыйшла да вываду, што, нягледзячы на тое, што элiністычны перыяд прывёў да тэрытарыяльнага распаўсюджвання рабства ва ўсходнім Міжземнамор'і, у многіх раёнах рабская праца не вызначала развіццё эканомікі ў цэлым, а выкарыстоўвалася нароўні з вольнай працай. Такія з'явы, як вялікая колькасць рабоў, выгадаваных дома, і ўзаемнае валоданне некалькімі людзьмі адным рабом — сведчанне таго, што рабаўладанне пранікала і ў сферу наёмных. Здача рабоў у наймы свабоднымі малазабяспечанымі людзьмі з'яўлялася істотнай крыніцай іх даходу.

У другім артыкуле — «Прымяненне рабскай працы ў грэка-рымскім Егіпце» (1973),— які ўвайшоў з некаторымі дапаўненнямі ў першы том манаграфіі «Рабства ў грэка-рымскім Егіпце» (1974), І. Бежуньска-Малавіст падвергла ўсебаковаму аналізу папірусныя крыніцы, а таксама абагульніла вынікі дасягненняў зарубежнай гістарыяграфіі (У. Вількен, В. Б. Вестэрман, К. Прэо) у тым ліку і савецкай (К. К. Зельін, А. Е. Казакевіч, А. І. Паўлоўская). Спасылаючыся на вядомую працу Ф. Гшнітцара [12], даследчыца завастрыла ўвагу на тым, што існуючыя ў грэчаскай мове тэрміны для абазначэння раба роўнацэнны і не выклікаюць ніякіх сумненняў, калі рэч ідзе аб іх значэнні ў егіпецкіх нарматыўных дакументах птоламееўскага і рымскага перыяду. У той жа час, у крыніцах другога характару — асабовых рахунках, пісьмах, прыватных дагаворах сустракаюцца многазначныя тэрміны, якія могуць адносіцца як да свабодных, так і да рабоў названага перыяду.

Прымаючы за аснову аналізу крыніцы архіва Зянона, даследчыца падкрэслівае, услед за К. Прэо, што даныя гэтых крыніц нельга безагаворачна распаўсюджваць на ўсе раёны Егіпта, таму што ўладанні Апалонія займалі тут асобнае месца.

Разглядаючы ролю рабскай працы ў сельскай гаспадарцы, І. Бежуньска-Малавіст прыходзіць да вываду, што ўладанні Апалонія рыхтавалі эліту рабоў, якія выконвалі самыя разнастайныя работы. Да працы на зямлі яны прыцягваліся спарадычна. Умовы пталамееўскага Егіпта, на думку аўтаркі, не спрыялі развіццю рабскай працы на сяле; палітыка Пталамееў развівалася хутчэй у напрамку аховы мясцовага сялянства як рабочай сілы, чым у напрамку пашырэння працы нявольнікаў. І. Бежуньска-Малавіст таксама падкрэслівае, што прымяненне рабскай працы ў сельскай гаспадарцы пталамееўскага Егіпта ішло на спад. Другая карціна назіраецца ў прымяненні рабскай працы ў рамястве, у прыватнасці рудніках і каменаломнях, у гандлі; асабліва ўзрасла роля дамашніх рабоў.

Аб развіцці дамашняга рабства ў пталамееўскім Егіпце пісалі многія вучоныя, але тут патрэбна адрозніваць хору (сельскую мясцовасць) і Александрыю. У апошняй, натуральна, была большая колькасць рабоў у якасці хатняй прыслугі з пэўнай спецыялізацыяй. Выкарыстанне рабскай працы ў Егіпце, заканчвае даследчыца, дасягае інтэнсіўнасці ў III ст. да н. э., калі яшчэ ў асяроддзі грэчаскіх каланістаў былі жывымі традыцыі грэчаскай радзімы.

Падводзячы вынікі, адзначым, што сацыяльна-эканамічныя аспекты эпохі элінізму ў даследаваннях польскіх вучоных (1945—1975) займаюць адно з важнейшых месц. Асаблівую ўвагу даследчыкі звярталі на пытанні гісторыі грэка-рымскага Егіпта, што тлумачыцца радам прычын: наяўнасцю параўнальна вялікай колькасці папірусных крыніц, пэўнымі дасягненнямі польскай археалагічнай думкі ў Егіпце пад кіраўніцтвам прафесара К. Міхалоўскага, і, безумоўна, павышаным навуковым інтарэсам да ўпамянутых праблем ва ўсёй зарубежнай, і, у першую чаргу, у савецкай гістарыяграфіі. У сукупнасці праблем, разглядаемых польскімі вучонымі, вызначаюцца пытанні аб становішчы рабоў, рамеснікаў і земляробаў у пталамееўскім Егіпце, аб сувязі рамяства з рынкам, узаемаадносінах свабоднага і несвабоднага насельніцтва, аб сутнасці царскіх уладанняў, аб адносінах

дзяржавы да сферы вытворчасці, аб юрыдычнай форме залежнасці. Усё гэтае дае багатую аснову для далейшых пошукаў і плённых даследаванняў.

[1] Гл.: Taubenschlag R. The Law of Greco-Roman Egypt in the ligt of the papyri (332 B. C.— 640 A. D.). New York, 1944. V. 1; Warszawa, 1948. V. 2.

[2] Гл.: Зельин К. К. Исследования по истории земельных отношений в Египте II — I вв. до н. э. М., 1960. С. 122—123.

[3] Гл.: Świderek A. W. W "państwie" Apollniosa: Społeczeńtwo wczesnoptolemejskie Fajum w świetle Archiwum Zenona. Warszawa, 1959.

[4] Клерухі — грамадзяне, якія атрымалі ў асабістае карыстанне зямельны надзел на тэрыторыі саюзнай дзяржавы або ў заваёванай краіне (каланісты).

[5] Гл.: Амусин И. Д. Термины, обозначающие рабов в эллинистическом Египте по данным Септуагинты // ВДИ. 1952. № 3; Блаватская Т. В., Голубцова Е. С., Павловская А. И. Рабство в эллинистических государствах в III—I вв. до н. э. М., 1969.

[6] Гл.: Zawadzki T. Z zagadnień struktury agrarno-społecznej krajów małoazjatyckich w epoce hellenizmu. Poznań, 1952; Idem: Queqes remarques sur l'etende et l'accroissement des domaines des grands temples en Asie Mineure // Eos. 1952/53. C. 46.

[7] Гл.: Kupiszewski H., Modzejewski J. Hyperetai. Etude des fonctions et le role des hyperetes dans l'administration civile et juridiciaire de l'Egypt greco romaine // The Journal of Juristic Papyrology. 1957. T. 11—12.

[8] Гл.: Wipszycka E. Formy produkcji rzemeśliniczej w Egipcie grecko-rzymskim // Przegląd historyczny. 1969. N 3.

[9] Гл. Фихман И. Ф. Египет на рубеже двух эпох. М., 1965.

[10] Гл.: Piątkowska M. La skepe dans l'Egypt ptolemaique. Wroclaw; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1975.

[11] Гл.: Biezuńska-Małowist I. Quelques formes non typiques de l'esclavage dans le monde ancien // Античное общество. Труды конференции по изучению античности. М., 1967; Idem: Zastosowanie pracy niewolniczej w Egipcie Lagidów // Przegląd historyczny. 1973. N 2; Idem: L'esclavage dans l'Egypte dans greco-romaine. V. 1; Periode ptolemaique. Warszawa. 1974; Idem: Sytuacia społeczna niewolników w Egipcie ptolemejskim // Kwartalnik historyczny. 1976. N 1.

[12] Гл.: Gschnitzer Fr. Studien zur griechischen Terminologie der Sklaverei. Bd. 1: Grundzüge des vorhellenischen Sprachgebrauchs. Wiesbaden, 1963.